

# Новыя вяршыні

**Прэміі Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру ўручаюцца адораным навучэнцам і студэнтам Гродзеншчыны з 2005 года. За час існавання гэтай традыцыі прэміяй былі адзначаны больш за 1600 чалавек. 51 чалавек атрымаў яе сёлета.**

Самай юнай удзельніцай урачыстасці стала Іра Зышчык з Ашмян. Яна вучыцца ў 3 класе сярэдняй школы № 2 і ў 2 класе Ашмянскай дзіцячай школы мастацтваў, іграе на балалайцы і цымбалах. Сярод творчых дасягненняў дзяўчынкі — перамогі ў міжнародных фестывалях мастацтваў "Новыя вяршыні" і "ByFest". Разам з Ірынай на ўрачыстую цырымонію запрасілі і яе маму Ганну Іванаўну, якая працуе загадчыкам сектара сацыяльна-педагагічнага цэнтра Ашмянскага раёна. І гэта таксама традыцыя — запрашаць на цырымонію бацькоў, настаўнікаў, сяброў намінантаў прэміі, старшынь праўленняў раённых арганізацый Беларускага фонду міру.

Віншаванне ў гэты дзень моладзь атрымала ад першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Галіны Курганскай, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Валянціны Баранавай, старшыні праўлення Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Івана Калбаскі.

Сярод першых на сцэну запрасілі навучэнца 10 класа Алекшыцкай сярэдняй школы Бераставіцкага раёна Уладзіслава Курчыцкага. Уладзіслаў — пераможца раённага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай і англійскай мовах і грамадазнаўстве, абласнога этапу конкурсу "Юны натураліст", абласнога конкурсу даследчых работ "Крыштальная альфа". Навучэнка 11 класа Варнянскага ясляў-сада — сярэдняй школы Астравецкага раёна Валерыя Папова праявіла сябе ў спорце: яна прызёр Гродзенскай вобласці па лёгкай атлетыцы, пераможца раённага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па прадмеце "Фізічная культура і здароўе", пераможца Рэспубліканскага конкурсу дзіцячых творчых работ "Пасланне ветэрану".

Навучэнка Ваўкавыскага каледжа Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Яна Кур'яновіч — лідар валанцёрскага руху, узначальвае атрад "Цёплыя рукі". Яна старшыня раённага валанцёрскага савета і член абласнога валанцёрскага савета. А вось студэнт 6 курса лячэбнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Андрэй Ваўкавыцкі актыўна займаецца навуковай работай, ён прызёр і ўдзельнік міжнародных канферэнцый, лаўрэат рэспубліканскага конкурсу навуковых работ.

Усе лаўрэаты прэміі праявілі сябе ў розных галінах дзейнасці, а аб'ядноўвае іх вялікая працаздольнасць і адказнасць. Як адзначыў Іван Калбаска, для многіх з іх сённяшняя ацэнка працы стане яшчэ адной прыступкай на шляху да вялікіх поспехаў.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**